**Алена Дзмітрук**
(Баранавічы)

# Праект Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам па арганізацыі сельскагаспадарчай працы ўрада ў Палескім ваяводстве

На пасяджэнні Савета Міністраў 18 жніўня 1926 г. правядзенне сельскагаспадарчай рэформы на „ўсходніх землях” было прызнана як асноўная задача з дапамогай якой аднachasова павінна вырашацца нацыянальная праблема[1].

Асноўнай мэтай селькагаспадарчай рэформы заяўлена перабудова аграрнай структуры, урэгуляванне адносін, забеспячэнне неабходных камунікацый. На першым этапе, на думку міністра, сельскагаспадарчая рэформа павінна была перанесці цэнтр цяжкасці на дзве праблемы, якія непарыўна звязаны паміж сабой: 1) перабудову дробных сельскіх гаспадарак з натуральных на таварна-грашовыя; 2) стварэнне супрацоўніцтва дзяржаўных установ і грамадскіх арганізацый на нізавым узроўні пры правядзенні парцэляцыі і камасацыі[2].

Але, каб станоўча вырашыць праблему, перш за ўсё патрабавалася ўрэгуляваць некалькі праблем: праблему заканадаўства, праблему „персанальнай палітыкі”, фінансавую. Праблему „персанальнай палітыкі” прапаноўвалася вырашаць у двух накірунках — знайсці адпаведных людзей для выканання рэформы і забяспечыць добрую арганізацыю працы праз змену адміністратыўнай сістэмы ў напрамку дэканцэнтрацыі ўлады і стварэння супрацоўніцтва пры яе выкананні паміж дзяржаўнымі органамі і грамадствам[3]. Такім чынам, першачарговымі сталі праблемы арганізацыйна-адміністратыўныя.

Пры вызначэнні задач на падрыхтоўчым этапе правядзення сельскагаспадарчай рэформы на ўзроўні „ўсходніх ваяводстваў” пілсудчыкі прыйшлі да згоды, што галоўнай праблемай „усходніх ваяводстваў” былі недахопы сацыяльныя (грамадскія), таму было вырашана гаспадарчую палітыку падпарадкаваць праблемам грамадскай палітыкі. Пры гэтым паспрабаваць схіліць на свой бок не эліту, але найбольш шырокія масы насельніцтва. Для пазбаўлення ад недахопаў у грамадска-вытворчых

[1] *Dokumenty w sprawie polityki narodowościowej władz polskich po przewrocie majowym*, „Dzieje Najnowsze. Kwartalnik poświęcony historii XX wieku”, R. IV, 1972, nr 3, s. 159.

[2] *Mowa W. Staniewicza, ministra Reform Rolnych na 321 posiedzeniu Sejmu 9 lutego 1927 r.*, [w:] Dziennik Urzędowy MRR, 1927 , nr 5, s. 126-127.

[3] Там жа.

умовах на ўсходніх землях прапанавалі ліквідаваць перажыткі калектыўнай псіхалогіі, паслабіць нацыянальныя, рэлігійныя, класавыя антаганізмы, часткова ліквідаваць пратэкцыянальную палітыку ў адносінах да польскага насельніцтва, правесці працу па гаспадарча карысным грамадскім выхаванні, па рацыянальнай арганізацыі вытворчасці. Навукоўцы адзначалі, што з пункту гледжання сацыялогіі гэтага тэарытычна дастаткова для павышэння вытворчасці, хаця пры гэтым нельга выключаць і іншыя — эканамічныя, юрыдычныя, тэхнічныя — фактары. Такім чынам, на першым этапе правядзення сельскагаспадарчай рэформы з усяго комплексу гаспадарчых спраў першачарговай стала задача рэформы грамадскіх умоў вытворчасці[4].

Таксама было прызнана, што рэалізацыя так акрэсленай праблемы гэта справа працяглага перыяду. „Адносна хутка і лёгка можна было б ліквідаваць эмацыянальныя і тэрміналагічныя перажыткі, (...) падобна з рэлігійнымі, на канец можна было б зараз парушыць наперад справу рацыянальнага ўдасканалення арганізацыі вытворчых груп, а таксама рэформы грамадскага выхавання. У той час ужо намнога больш памкненняў і часу займуць нацыянальныя справы (...)”[5]. Шмат часу трэба гарманічнаму ўздзеянню грамадскага выхавання і рацыянальнай арганізацыі вытворчых груп, каб звесці да мінімуму класавую барацьбу. Адзначалася, што яна амаль не аднатоўваецца ў дробных самастойных гаспадарках. Апошнія сталі асноўным аб’ектам працы. У якасці сродкаў, якія дапамагаюць павысіць вытворчасць, а значыць дабрабыт насельніцтва, прапанавалі гарантыю ўласнасці і сельскагаспадарчыя веды. Але таксама адзначалі, што не можа быць дабрабыту без умелай вытворчасці, без мэтанакіраванага, рацыянальнага кіравання сіламі і сродкамі[6]. Разам з пашырэннем прафесійнага ўзроўню планавалася шырокамаштабнае польскае культурнае ўздзеянне на сялянскае грамадства. Такім чынам, сельскагаспадарчая рэформа павінна была стаць сродкам развіцця буржуазных адносін і дзяржаўнай асіміляцыі, у галоўным палітыка-гаспадарчым метадам.

Паўстала пытанне хто і як будзе рэалізоўваць пастулаты ўрада ў вызначаным накірунку. Да 1932-1933 гг. у галіне сельскагаспадарчых праблем з дзяржаўнымі ваяводскімі ўстановамі з боку грамадства супрацоўнічалі, як правіла, ваяводскія і акруговыя таварыствы сельскагаспадарчых арганізацый і гуртоў ды органы мясцовага самакіравання. Аднак, фактычна ніводнае з павятовых самакіраванняў не займалася самастой-

[4] S. Orsini-Rosenberg, *Zagadnienia styczne polityki gospodarczej i technologji społecznej na Ziemiach Wschodnich Rzeczypospolitej*, „Prace Instytutu Badania Stanu Gospodarczego Ziem Wschodnich”, R. 1, 1927, nr 1, s. 124.

[5] Там жа, с. 125.

[6] Там жа, с. 111.

на сельскагаспадрчымі справамі, а прызначала некаторыя квоты ў межах сваіх бюджэтаў у якасці субсідый на працу акруговых таварыстваў. Гэтыя арганізацыі на „ўсходніх землях" складаліся ў асноўным з асаднікаў, мясцовага польскага насельніцтва і з'яўляліся фундаментам, на якім будаваўся Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам (далей: ББ ці ББСУ).

Ва ўмовах гаспадарчага крызісу 1930-х гг. урад прыпыніў фінансаванне акруговых таварыстваў арганізацый і сельскагаспадарчых гуртоў, што прывяло да спынення іх дзейнасці і не толькі ў сельскагаспадарчай галіне, але і ў грамадскай працы, якая насіла палітычнае значэнне.

У Навагрудскім і Віленскім ваяводствах важныя функцыі па павышэнню сельскагаспадарчага ўзроўню перахапілі агульна-грамадскія і культурна-асветніцкія арганізацыі, якія змянілі метады дзейнасці і галоўны націск паклалі на сельскагаспадарчыя конкурсы (рознага роду акцыі „Пшыспособеня рольнэго") і перадавыя гаспадаркі, што дазволіла, нягледзячы на эканамічныя цяжкасці, не толькі не зменшыць, але нават узмацніць сельскагаспадарчыя працы, асабліва конкурсы сярод моладзі, якія падхапілі Саюз сялянскай моладзі, Саюз стральцоў, Таварыства каталіцкай моладзі. Зусім іншая сітуацыя склалася ў Палескім ваяводстве, дзе грамадскія арганізацыі не мелі „цвёрдых асноў для жыцця". Акруговае таварыства было амаль адзінай галіновай арганізацыяй, абшар дзейнасці якой распаўсюджваўся на ўсё ваяводства. Перапыненне яе дзейнасці паралізавала не толькі сельскагаспадарчую працу, але і працу па павышэнню сельскагаспадарчага ўзроўню, так званую грамадска-палітычную. Спробы ваяводы рэанімаваць яе праз персанальнае аб'яднанне пасады сельскагаспадрчага рэферэнта самакіравання і кіраўніка акруговага таварыства не мела поспеху, бо санкцыянавала фактычны стан.

Пошукі рашэнняў ішлі як на цэнтральным, так і мясцовым узроўні. Задача ўскладнялася тым, што ўрад прапаноўваў арганізацыі не толькі перайсці да прынцыпу фінансавай самадастатковасці, добраахвотнага характару яе прац, але і перайсці да масавага ўздзеяння на сельскагаспадарчае насельніцтва дадзенага рэгіёна.

Крытыкуючы працу акруговых таварыстваў і сельскагаспадарчых гуртоў на ўзроўні ваяводства ўлады адзначалі, што на Палессі гэтая арганізацыя „не ўцягнула ў кола сваіх інтарэсаў шырокіх мас, звязаных з сельскай гаспадаркай, наадварот, абапіралася на „элемент (...) маючы свядомасць, які рэкрутаваўся галоўным чынам з землеўласнікаў і вайсковых ды грамадзянкіх асаднікаў"[7]. Гэтая арганізацыя здолела аб'яднаць вакол сябе за час свайго існавання толькі 4% сельскага насельніцтва. Ва ўмо-

[7] J. Strowski, *Związki rolnicze na Polesiu*, Brześć nad Bugiem 1935, s. 8.

вах эканамічнага крызісу непрымальным аказаўся індывідуальны характар грамадскай працы. Згодна з асноўнымі яе палажэннямі мэтанакіраванае і масавае ўздзеянне на сельскагаспадарчае насельніцтва прапаноўвалася аказваць праз рацыянальную траістую выхаваўчую арганізацыю грамадства: польскія землеўласнікі могуць даць піянерам-асаднікам прафесійную асвету, якая праз гаспадаркі асаднікаў павінна пранікаць да прымітыўных сялянскіх гаспадарак[8]. Такое гаспадарчае ўздзеянне пасрэдна павінна было аказваць уплыў таксама і на грамадскае выхаванне асобы. Такім чынам апошнія ўскосна б „праменявалі" ў прывітым духу на акаляючае асяроддзе, а культура і прагрэс паступова пранікалі да шырокіх слаёў насельніцтва, якія знаходзіліся па-за сферай непасрэднага ўздзеяння польскіх сельскагаспадрчых арганізацый. Такі індывідуальны характар грамадскай працы акрэсліваў і метады працы: канцэпцыю конкурсаў, узоравых гаспадарак, т.зв. акцыі пасрэднага ўздзеяння на масы шляхам індывідуальнага прывіцця культуры.

„Зараз не можам дазволіць сабе на індывідуальную працу сярод асоб, не закранаючы мас, бо выклікаем не толькі гаспадарчую, але і палітычную небяспеку. Не можам пакінуць 95% насельніцтва і працаваць сярод 5% з той надзеяй, што гэтыя 5% будуць павольна пашырацца"[9].

Але для таго, каб перайсці да масавага ўздзеяння, трэба было вырашыць дзве прынцыповыя праблемы. Як забяспечыць лідарства-кіраўніцтва палякаў у гэтых арганізацыях, а значыць забеспечыць іх уплыў на грамадскую акцыю ў Палескім ваяводстве, дзе польскае насельніцтва складала выразную меншасць? Як прывабіць сялянскае насельніцтва і ўцягнуць яго ў працу польскіх грамадскіх арганізацый?

Рашэнне было прапанавана на павятовым з'ездзе гаспадарчых і грамадскіх дзеячоў ББСУ у Драгічыне, які праходзіў 3 верасня 1933 г. На ім была прадстаўлена новая структура — Міжкамунальны саюз гмін для падтрымкі сельскай гаспадаркі, — якая стала новай арганізацыйнай формай грамадскай працы ББ у павеце, дзе галоўнай арганізацыяй, якая канцэнтруе арганізацыі, з'яўлялася (спаланізаванае) самакіраванне, на чале якога стаялі старасты.

„Трэба было так арганізаваць працу, каб яна фармальна праводзілася самакіраваннем, фактычна аб'ядноўвала б вакол сябе шырокія масы сельскагаспадарчага насельніцтва (...)"[10].

Ссыпка збожжа з рознымі акцыямі на прынцыпах кааператываў па-

[8] S. Orsini-Rosenberg, *Zagadnienia styczne polityki gospodarczej...*, s. 145.

[9] Archiwum Akt Nowych (dalej: AAN), Akta osób i rodzin, zesp. 323 K. Lewiński, k. 12. Дзейнасць ББСУ ў галіне грамадска-гаспадарчых прац на тэрыторыі Палескага ваяводства. Справаздачы з'ездаў, распараджэнні, палітычна-гаспадарчыя камунікаты 1933-1935 гг.

[10] J. Strowski, *Związki rolnicze na Polesiu*, s. 12.

вінен быў стаць зыходным пунктам для стварэння арганізацый, якія будуць ахопліваць шырокія масы[11].

Гэтая справа дазваляла вырашыць адразу комплекс задач разнароднага характару. Па-першае, разглядалася як акцыя самадапамогі на выпадак неўраджаю. Па-другое, як спосаб замены збожжа на больш якаснае (спосаб стварэння прадукцыі сеўнага матэрыялу і паднясення рэнтабельнасці гаспадарак). Па-трэцяе, як беспрацэнтны крэдыт, які абапіраецца на збожжа (лепшы, чым валютны, які залежаў ад ваганняў цаны збожжа), Па-чацвёртае, як дзяржаўная акцыя, якая дазваляе рэгуляванне на карысць селяніна цэн збожжа (у перыяд добрай кан'юнктуры прадаць і карысна размясціць грошы, а ў перыяд нізкіх цен плаціць пры закупе больш высокую цану, каб утрымліваць цэны на ўзроўні забеспячэння інтарэсаў селяніна). Па-пятае, гэтая акцыя павінна была стаць добрай асновай (зместам працы) для стварэння кааператываў і іншых добраахвотных гаспадарча-грамадскіх арганізацый і такім чынам дазваляла развіваць грамадскі рух на тэрыторыі.

Такім чынам гэтая акцыя павінна была зацікавіць мясцовае сялянскае насельніцтва і дазваляла не толькі ўцягнуь яго ў працу польскіх таварыстваў, але і стварала магчымасці для падняцця іх дабрабыту, стварэння пачуцця павагі і ўдзячнасці да дзяржавы, што ў сваю чаргу надавала ўмовы для карыснага грамадскага выхавання і далейшага развіцця арганізацый.

Для стварэння ўмоў сталага ўздзеяння неабходна было забяспечыць арганізацыйныя асновы створанай структуры, г.зн. юрыдычныя і фінансавыя.

Прыналежнасць да арганізацыі выражалася ў членскім узносе — ссыпцы збожжа (два кілаграмы на адзін гектар зямлі). Членамі станавіліся ўсе самастойныя сяляне. Фінансавыя сродкі павятовых сельскагаспадарчых саюзаў складваліся не толькі з членскіх узносаў, але і з субсідый гаспадарчага і тэрытарыяльнага самакіравання, з даходаў прадпрыемстваў і арганізацый, якія ствараліся на прынцыпах кааператываў і павінны былі займацца продажам збожжа і карысным размяшчэннем атрыманых грошай.

У сувязі з тым, што менавіта кааператыўны рух, на думку ўрада, павінен быў адыграць рухаючую ролю па выйвадзе мас з крызісу, а з-за таго, што ў „крэсавых умовах рэдка назіраюцца ўдалыя спробы" іх стварэння, то самакіраванне павінна было стаць стваральнікамі каапeратываў. Пры гэтым гміна павінна была прадставіць памяшканне, абсталяванне і апеку ў выглядзе работнікаў гміны, якія павінны ўвайсці ў праўленне і бясплатна аказваць дапамогу пры іх будаўніцтве.

[11] Там жа с. 13.

Такім чынам, дзейнасць дадзенай арганізацыі абапіралася на мясцовае самакіраванне. Па-першае, яно мела „цвёрды падмурак” для існавання — фінансавыя сродкі, магчымасці прыцягваць розныя слаі насельніцтва, забяспечыць працягласць працы і магчымасць вырашаць праблемы, якія перарастаюць магчымасці таварыстваў, або юрыдычныя асновы ўстаноў. Па-другое, яно не пагражала добраахвотным арганізацыям, або іншым грамадскім групам, але стварала аснову для будучай добраахвотнай „у поўным гэтага слова сэнсе грамадска-гаспадарчай арганізацыі, (...) бо ахоплівае інтарэсы ўсіх і не можа супрацьпастаўляцца якой-небудзь групе (...) кожная група захоўвае сваю індывідуальнасць, ствараючы фрагмент (...) у цэласнай арганізацыі працы”[12]. Міжкамунальны гмінны саюз павінен быў стаць дапаўненнем самакіравання ў галіне арганізацыі грамадства і гаспадарчых задач.

Тэрытарыяльнае самакіраванне, у выглядзе павятовага аддзела, які ўзначальваў стараста, павінна было ажыццяўляць нагляд над саюзам і мець права ўмешвацца ў фармальна-праўныя і фінансавыя справы, прафесійную дзейнасць саюза, бо апошні абапіраўся на грамадскія сродкі[13]. Акрамя гэтага, яшчэ напярэдані павятовага з’езда гаспадарчых і грамадскіх дзеячаў ББСУ ў Драгічыне гэтая канцэпцыя была апрабавана на практыцы. Яшчэ 13 лютага 1933 г. была дасягнута дамова паміж Праўленнем Міжкамунальнага гміннага саюза Драгічынскага павета і Праўленнем Акруговага таварыства сельскагаспадарчых арганізацый і гуртоў аб пераразмеркаванні кампетэнцый.

Акруговае таварыства сельскагаспадарчых арганізацый і гуртоў працягвала сваю дзейнасць, але павінна была звярнуць увагу на чыста прафесійныя сельскагаспадарчыя задачы — сеўны матэрыял, вопытныя станцыі, развіцце жывёлагадоўлі. Працаваць яно павінна было перш за ўсё сярод землеўласнікаў і асаднікаў, якія, перабудоўваючы згодна з рэкамендацыямі свае гаспадаркі-прадпрыемствы на спецыялізаваную прадукцыю, павінны былі стаць лідарамі сельскагаспадарчай вытворчасці. Планавалася, што яны самі знойдуць спажыўцоў для сваёй прадукцыі сярод сялянскай масы і, такім чынам, будуць садзейнічаць не толькі павышэнню ўзроўню дробных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, але адначасова ўцягнуць у грамадска-гаспадарчую працу шырокія сялянскія колы.

Сферай дзейнасці Міжкамунальнага гміннага саюза павінна была стаць прадуманая прапаганда. Па задумцы, ён павінен быў прыцягнуць

[12] AAN, Akta osób i rodzin, zesp. 323 K. Lewiński, k.12.

[13] AAN, Akta osób i rodzin, zesp. 323 K. Lewiński, k. 24. Ацэнка дзейнасці і арганізацыя павятовых сельскагаспадарчых саюзаў на Палессі. Справаздачы, праект распараджэнняў ваяводы 1933-1935 гг.

да працы асноўную масу сельскагаспадарчага насельніцтва і з дапамогай месячных гмінных і грамадскіх сходаў, планавага друкаванага слова і сістэмы прывіцця масам не толькі сельскагаспадарчых ведаў, але і культурна-грамадскіх праблем[14].

Ідэя Міжкамунальнага саюза гмін Драгічынскага павета для падтрымкі сельскай гаспадаркі знайшла падтрымку ўлад і стала першаўзорам пры стварэнні ў 1934 г. павятовых сельскагаспадарчых саюзаў ва ўсіх дзевяці паветах Палескага ваяводства. У межах іх дзейнасці стваралася надбудова на ваяводскім узроўні — Палескі ваяводскі сельскагаспадарчы саюз, які павінен быў забяспечыць цэласнасць ахопу рэгіянальных гаспадарчых спраў[15]. У рамках павятовых саюзаў дзейнічалі тры секцыі — грамадска-асветніцкая, сельскагаспадарчая, гаспадарча-кааператыўная, якія займаліся непасрэднай працай.

Грамадска-асветніцкая секцыя займалася правядзеннем гаспадарчых сходаў, развіццём чытання, падпіскай прэсы, будаўніцтвам і працай у народных дамах, прапагандай і працай з вясковай моладдзю. Найбольш актыўна ў ёй працавалі настаўнікі.

Галоўнымі справамі сельскай секцыі стала стварэнне лакальнай прадукцыі пасяўнога зерня праз ссыпку збожжа, яго распаўсюджванне, прапаганда і ўвядзенне сельскагаспадарчых машын і прылад, паляпшэнне прынцыпаў сельскагаспадарчай тэхналогіі. Галоўная стаўка ў працах секцыі была зроблена на выхаванцаў сельскагаспадарчых школ, якія павінны былі вяртацца ва ўласныя гаспадаркі і, выкарыстоўваючы атрыманыя веды, уводзіць інавацыі, павышаць свой аўтарытэт, станавіцца лідарамі сельскагаспадарчай тэхналогіі ў сваім асяродку.

Але найбольш увагі надавалі працам кааператыўнай секцыі, на якую былі пакладзены асаблівыя надзеі ў развіцці кааперытыўнага руху на Палессі. У рамках секцыі павінны былі стварацца рознага роду сельскагаспадарчыя гандлёва-спажывецкія кааператывы для рэгулявання гаспадарчага жыцця павета, выканання распрацаванага Палескім ваводскім сельскагаспадарчым саюзам адзінага павятовага кааператыўнага плана. За імі замацоўвалася планавая акцыя ссыпкі і збыту збожжа з дапамогай гмінных зернясховішчаў, удзел у скупцы збожжа для прамыслова-збожжавых прадпрыемстваў па даручэнню ваяводскай цэнтральнай арганізацыі па ваенных пастаўках, а таксама размеркаванне збожжа на мясцовых рынках. Па даручэнню прафесійных сельскагаспадарчых арганізацый гэтыя кааператывы павінны былі забяспечваць сялян пасяўным зернем з дапамогай гмінных зернясховішчаў. Прапаноўвалася стварэнне оптава-спажывецкага аддзела прадуктаў першай

[14] AAN, Akta osób i rodzin, zesp. 323 K. Lewiński, k. 12.
[15] AAN, Akta osób i rodzin, zesp. 323 K. Lewiński, k. 24.

неабходнасці, які павінен быў стаць оптавым для райёнага сельскагаспадарчага кааператыва. Прадугледжвалася магчымасць стварэння аддзела машын і сельскагаспадарчых прылад, угнаенняў, будаўнічага матэрыялу на прынцыпах гаспдарчай самадастатковасці. Акрамя гэтага секцыя павінна была аказваць дапамогу для сваіх членаў, якія ўдзельнічалі ў ссыпцы збожжа, пры выплаце падаткаў[16]. Праца менавіта гэтай секцыі павінна была садзейнічаць развіццю дабрабыту сялян і прывабліваць іх да ўдзелу ў арганізацыі, а той у сваю чаргу павінен быў прывесці „да падняцця культуры і ўзроўню жыцця сельскага насельніцтва"[17].

Павятовыя сельскагаспадарчыя саюзы як адзіныя тэрытарыяльныя арганізацыі павінны былі ахапіць усе сельскагаспадарчыя працы ў павеце, абапірацца ў сваёй працы на гміны, а іх дзейнасць узгадняцца на ўзроўні ваяводства як гаспадарчай цэласнасці.

Але тут паўсталі юрыдычныя цяжкасці, бо згодна з распараджэннем прэзідэнта ад 22 сакавіка 1928 г. аб сельскагаспадарчых палатах і распараджэннем міністра сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчых рэформ, арганізацыяй, якая павінна звязваць працу добраахвотных сельскагаспадарчых арганізацый і тэрытарыяльнага самакіравання, прызнана Сельскагаспадарчая палата (ізба). У сувязі з гэтым пратаколам ад 13 снежня 1934 г. было замацавана размежаванне кампетэнцый паміж Палескай сельскагаспадарчай палатай і павятовымі саюзамі. Палескае прафесійнае самакіраванне павінна было дапамагаць саюзу, асабліва ў галіне грамадска-асветніцкай (праз падрыхтоўку друкаў, аб'яднаных у цыклы, праз удзел інспектараў палаты ў гаспадарчых гмінных і грамадскіх сходах), а таксама ажыццяўляць інспекцыю гмінных зернясховішчаў, кантраляваць прыбыткі Палескага ваяводскага сельскагаспадарчага саюза. Павятовыя саюзы ў сваю чаргу павінны былі арганізоўваць гмінныя сходы і грамадства, выбіраць тэмы для сходаў, праводзіць практычныя заняткі ў полі, інструктары павінны былі праводзіць працу над павышэннем узроўню сельскагаспадарчай тэхналогіі і па ўзгадненню з палатай праводзіць ссыпку збожжа. Сельскагаспадарчая палата вызначала час правядзеня ссыпкі, выказвалася пры правядзенні пасяўной акцыі і па праблемах арганізацыі збыту прадукцыі і кааператываў[18].

Кіраўнікі павятовых сельскагаспадарчых саюзаў былі падпарадкаваны прафесійнаму сельскагаспадарчаму інструктару („няважна кім будзе субсідзіравацца: арганізацыямі, палатай ці тэрытарыяльным сама-

[16] AAN, Akta osób i rodzin, zesp. 323 K. Lewiński, k. 24.
[17] AAN, Akta osób i rodzin, zesp. 323 K. Lewiński, k.12.
[18] AAN, Akta osób i rodzin, zesp. 323 K. Lewiński, k. 11. Дзейнасць Палескай сельскагаспадарчай палаты і яе супрацоўніцтва з Палескім ваяводскім сельскагаспадарчым саюзам. Пратаколы.

кіраваннем”). Апошнія персанальна адказвалі перад павятовым аддзелам (на чале са старастам), але іх прафесійную дзейнасць кантралявала сельскагаспадарчая палата, якая выказвалася наконт іх прызначэння на пасаду пры прыёме на працу. Усе субсідыі, якія выдзяляліся на грамадскія арганізацыі ў ваяводстве, передаваліся выключна павятовым сельскагаспадарчым саюзам як адзінай арганізацыі, якая ажыццяўляла грамадска-гаспадарчую акцыю. Ім жа падпарадкавалі ўсіх іншых інструктараў[19].

Такім чынам, у рамах ББСУ была распрацавана новая арганізацыйная форма працы ўрада на Палессі ў гаспадарча-грамадскай галіне. З аднаго боку, яна адпавядала патрабаванням урадавых колаў — ахоплівала ўвесь комплекс сельскагаспадарчых праблем ваяводства, аб’ядноўвала ўвесь спектр грамадска-гаспадарчых арганізацый, была фінансава самадастатковай. З другога — улічвала мясцовыя асаблівасці ваяводства і дазваляла ўцягнуць у працу па павышэнню ўзроўню вытворчасці сельскай гаспадаркі шырокія масы сялян, забяспечвала кіраўнічую ролю палякаў, якая ажыццяўлялася праз апору на спаланізаванае самакіраванне і кантроль над грамадска-гаспадарчымі працамі з боку ўлад у асобе старасты. Акрамя гэтага была забяспечана працягласць выхаваўчага ўздзеяння на сельскае насельніцтва праз вызначэнне крыніц фінансавання арганізацыі, праз дакладнае размеркаванне функцый паміж рознымі ўстановамі, што было юрыдычна замацавана.

**Alena Dzmitruk** — pracownik naukowy Katedry Państwa i Prawa Uniwersytetu Państwowego w Baranowiczach.

[19] AAN, Akta osób i rodzin, zesp. 323 K. Lewiński, k. 24.